Дзяржаўная установа адукацыі “Дзіцячы сад № 35 г. Наваполацка”

Намінацыя «Гуляем і размаўляем па-беларуску»

Дыдактычная гульня-віктарына

# *«Падарожнічаем па Беларусі»*

Аўтары:

Маліноўская Наталія Андрэеўна, намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці;

Марцулевіч Анастасія Іванаўна, выхавальнік дашкольнай адукацыі першай кваліфікацыйнай катэгорыі;

Кавалёва Вольга Мікалаеўна, выхавальнік дашкольнай адукацыі першай кваліфікацыйнай катэгорыі;

Кірпічова Марына Ўладзіміраўна, выхавальнік дашкольнай адукацыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

***Дыдактычная гульня-віктарына “Падарожнічаем па Беларусі”***
***Тэхнічны пашпарт***

**Гульнявое поле:** аснова – квадрат памерам 50 / 50 сантыметраў, з выявай карты Рэспублікі Беларусь, па перыметры асновы – квадраты памерам  сантыметраў, розных колераў, якія адпавядаюць блокам з заданнямі.

**Матэрыял:** пластык.

**Гульнявое абсталяванне:** гульнявое поле з картай Беларусі памерам 50 / 50 см., фішкі (6 шт.), кубік, карткі з заданнямі (выраблены з ламініраванай паперы), размеркаванымі па шасці блоках (кожны блок заданняў абазначаны пэўным колерам).







**АНАТАЦЫЯ**

Дыдактычная гульня-віктарнына прызначана для дзяцей дашкольнага ўзросту ад 5 да 7 гадоў і дазваляе замацоўваць і сістэматызаваць веды дзяцей аб славутых людзях Беларусі, нацыянальных стравах Рэспублікі Беларусь, беларускай народнай творчасці, жывёлах і раслінах нашай Радзімы, яе славутасцях; актывізаваць беларускае маўленне. Дадзены дапаможнік садзейнічае выхаванню у дзяцей павагі і любові да радзімы, жадання паглыбляць і пашыраць свае ўяўленні пра яе.

Маляўнічая і незвычайная форма гульні выклікае цікавасць у выхаванцаў старэйшага дашкольнага ўзросту. Шырокі спектр

заданняў і напрамкаў дазваляе педагогу рэалізаваць большую частку раздела “Дзіця і грамадства” вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

**Мэта:** замацаванне і сістэматызацыя ўяўленняў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту аб гістарычных асобах і славутасцях, прыродных аб’ектах, культурнай спадчыне рэспублікі Беларусь.

Выкарыстанне гульнявога дапаможніка у рабоце з выхаванцамі дапаможа развіццю:

-уяўленняў аб значнасці і каштоўнасці ведаў аб сваёй краіне;

-мыслення, памяці, маўлення, успрымання, увагі;

выхаванню цікавасці да радзімы, патрыятычных пачуццяў.

Дыдактычная гульня-віктарына “Падарожнічаем па Беларусі” – гэта яшчэ і своеясаблівы даведнік, у якім выхаванцы могуць праз выкарыстанне QR-кодаў атрымаць азнаямленчую інфармацыю пра гарада, славутасці і памятныя мясціны Беларусі.

## Ход гульні

Гульцы (2 – 6 чалавек) ставяць фігуркі на поле з надпісам “СТАРТ”. Першы гулец кідае кубік. Колькасць кропак на верхняй грані кубіка паказвае на колькасць ходаў. Гулец перамяшчае фігурку на патрэбны квадрат, выцягвае з канверту картачку адпаведнага колеру з заданнем, выконвае яго.

Калі гулец не зможа выканаць прапанаванае заданне, ён прапускае ход. Перамагае той, хто першым прыйдзе да фінішу.

*Варыянт з выкарыстаннем электронных рэсурсаў: на карце размешчаны QR-коды. Пры іх актывізацыі ўдзельнік гульні можа азнаёміцца з інфармацыяй аб славутасцях і памятных мясцінах Беларусі.

Гульнявы дапаможнік прадугледжвае пашырэнне і дапаўненне спектра заданняў па меры засваення выхаванцамі наяўнай у заданнях інфармацыі.

## *БЛОКІ З ЗАДАННЯМІ*

**Блок “Славутыя людзі Беларусі” (квадрат сіняга колеру)**

**Мэта:** замацаванне ведаў аб пісменніках, практыкаванне ў знаходжанні сярод дадзеных партрэтаў партрэты беларускіх пісменнікаў, паэтаў; практыкаванне ў вылучэнні сярод прыведзеных патрэтаў партрэты славутых асветнікаў Полаччыны; практыкаванне ў суаднясенні ўрыўка верша з партрэтам аўтара, які яго напісаў; развіццё эманацыйнага ўспрымання вершаў на на беларускай мове.

**Матэрыялы і абсталяванне:**

карткі з заданнямі ў канверце, картка-падказка. (Дадатак 1, 2)




**Блок “Нацыянальныя стравы Беларусі” (квадрат аранжавага колеру)**

**Мэта:** практыкаванне ў знаходжанні сярод прапанаваных карцінак з выявамі страў стравы з бульбы; практыкаванне ў знаходжанні сярод карцінак з выявамі страў стравы беларускай нацыянальнай кухні; замацаванне ведаў аб беларускіх стравах;

замацаванне ведаў аб тым, якія прадукты харчавання патрэбны для прыгатавання беларускіх страў, практыкаванне ў іх знаходжанні сярод прапанаваных выяў.

**Матэрыялы і абсталяванне:**

картачкі з заданнямі ў канверце, картка-падказка. (Дадатак 3, 4)





**Блок “Беларуская народная творчасць” (квадрат чырвонага колеру)**

**Мэта:** замацаванне умення абагульняць і называць беларускія рамёствы (ганчарства, ткацтва, саломапляценне, разьба па дрэве); практыкаванне у називанні прадметаў, выраблених з розных прыродных матэрыялаў (гліны, саломы, дрэва, лёну); замацаванне умення вымаўляць назвы прыроднага матэрыяла і вырабаў з іх па-беларуску; практыкаванне ва уменні распазнаваць і называць элементы беларускага нацыянальнага касцюма.

**Матэрыялы і абсталяванне:**

карткі з заданнямі ў канверце. (Дадатак 5)



**Блок “Жывёлы і расліны Беларусі” (квадрат зялёнага колеру).**

**Мэта:** актывізацыя і замацаванне ведаў аб тым, якія дрэвы растуць у лясах Беларусі; актывізацыя і замацаванне ведаў аб тым, якія прыродныя сімвалы ёсць у Рэспубліцы Беларусь; актывізацы і замацаванне ведаў аб тым, якія расліны (жывёлы) занесены ў чырвоную кнігу Беларусі; замацаванне ведаў аб тым, якая расліна з даўніх часоў выкарастоўвалася для вырабу тканіны, якая жывёла самая буйная на тэрыторыі Белаunion.

**Матэрыялы і абсталяванне:**

карткі з заданнямі ў канверце, картка-падказка. (Дадатак 6,7)



**Блок “Гульня-віктарына” (квадрат жоўтага колеру).**

**Матэрыялы і абсталяванне:** карткі з пытаннямі. (Дадатак 8)

**Мэта:** замацаванне ведаў пра Беларусь, дзяржаўныя сімвалы, родны горад Наваполацк, горад Минск.



**Блок “Вандроўка па карце Рэспублікі Беларусь” (квадрат фіялетавага колеру).**

**Мэта:** замацаванне ведаў аб тым, колькі абласцей у Беларусі, уменне іх называць і паказваць; практыкаванне ў называнні галоўных гарадоў кожнай вобласці; актывізацыя ведаў аб тым, якая вобласць сутыкаецца з усімі абласцямі; замацаванне ведаў пра тое, які горад з‘яўляецца самым старажытным у Беларусі; актывізацыя ведаў аб тым, якія славутасці знаходзяцца ў кожнай вобласці.

**Матэрыялы і абсталяванне:** карта Беларусі на гульнявым полі, карткі з пытаннямі. (Дадатак 9)



**Блок “Размаўляем на роднай мове” (квадраты шэрага колеру).**

**Мэта:** практыкаванне ў перакладзе слоў з рускай на беларускую мову; замацаванне умення называць словы з характэрнымі беларускімі гукамі [ў], [дз], [дж], [г], [ч]; практыкаванне ва уменні складаць сказы з зададзеным словам.

**Матэрыялы і абсталяванне:** карткі з пытаннямі. (Дадатак 10).



**Літаратура:**

Вучэбная праграмма дашкольнай адукацыі . – Мінск: нац. ін-тадукацыі , 2022.

А. Л. Давидович, Е. И. Смолер, “Мир , в котром я живу”. – Мінск: нац. ін-тадукацыі , 2020.

Л. Давидович, В. Л. Пашко “Путешествие в мир правильной речи”, - Мінск: нац. ін-тадукацыі , 2020.

Дадатак 1

*Знайдзі і назаві беларускіх пісьменнікаў*

*Знайдзі і назаві беларускіх паэтаў*

*Знайдзі і назаві славутых людзей Полаччыны*

*Паслухай верш і назаві аўтара*

*Добра ў лузе ў час палудны!*
*Лёгка там дыхнуць!*
*Хмаркі белыя марудна*
*За лясы плывуць.*

*Паслухай верш і назаві аўтара*

*Здароў, марозны, звонкі вечар!*
*Здароў, скрыпучы, мяккі снег!*
*Мяцель не вее, сціхнуў вецер,*
*І волен лёгкіх санак бег.*

*Паслухай верш і назаві аўтара*

*Мой мілы таварыш, мой лётчык,*
*Вазьмі ты з сабою мяне!*
*Я – ведай – вялікі ўжо хлопчык*
*І ўмею ўжо лётаць у сне.*

Дадатак 2












Дадатак 3

*Знайдзі і назаві,*
*што патрэбна для*
*прыгатавання дранікаў*

*Знайдзі і назаві,*
*што патрэбна для*
*прыгатавання налiснiкаў*

*Знайдзі і назаві,*
*што патрэбна для*
*прыгатавання хлеба*

*Знайдзі і назаві,*
*што патрэбна для*
*прыгатавання кіселя*

*Знайдзі і назаві*
*беларускія стравы*

Дадатак 4






МУКА
Молоко
100%
СОЛЬ
ЭКСТРА


МУКА
Молоко
100%
СОЛЬ
ЭКСТРА


СОЛЬ
ЭКСТРА
МУКА
Молоко
100%

Дадатак 5

*Назаві беларускія народныя промыслы*

*Назаві элементы беларускага жаночага касцюма*

*Назаві элементы беларускага мужчынскага касцюма*

*Назаві вырабы, якія зможа вырабіць рамеснік з саломы*

*Назаві вырабы, якія зможа вырабіць рамеснік з лёну*

*Назаві вырабы, якія зможа вырабіць рамеснік з дрэва*

*Назаві вырабы, якія зможа вырабіць рамеснік з гліны*

Дадатак 6

*Знайдзі жывёл і расліны занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь*

*Назаві прыродныя сімвалы Рэспублікі Беларусь*

*Якія дрэвы растуць у лясах Рэспублікі Беларусь?*

*Назаві расліну, якую беларусы з даўніх часоў выкарыстоўваюць для вырабу тканіны*

*Назаві самага буйнога звера нашай Рэспублікі*

Дадатак 7



Дадатак 8

*Як называецца дзяржава, у якой мы жывём?*

*Назаві дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь*

*Якога колеру сцяг нашай краіны?*

*Хто з'яўляецца прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь?*

*Які від транспарту ёсць толькі у горадзе Мінску?*

*У якую кнігу занесены рэдкія віды жывёл і раслін?*

*Як называецца горад, у якім мы жывём?*

*Як называецца галоўная вуліца нашага горада?*

*Што адлюстравана на гербе нашага горада?*

*Што адлюстравана на гербе Рэспублікі Беларусь?*

*На якой рацэ стаіць горад Наваполацк?*

*Як называецца сталіца Рэспублікі Беларусь?*

Чаму нашу краіну называюць "сінявокай"?

Дзе мы можам убачыць Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь?

Што такое гімн?

Калі гучычь Дзяржаўны гімн?

Што трэба рабіць, калі гучыць Дзяржаўны гімн?

Якое званне было прысвоена гораду Мінску за мужнасць і гераізм яго жыхароў у гады вайны?

Дадатак 9

*У якім горадзе знаходзіцца Сафійскі сабор?*

*Якая вобласць сутыкаецца з усімі абласцямі? Пакажы яе на карце.*

*Колькі абласцей у Рэспубліцы Беларусь? Назаві і пакажы.*

*Назаві галоўны горад кожнай вобласці*

*Які горад самы старажытны ў Беларусі? Пакажы вобласць у якой ён знаходзіцца.*

*Назаві славутасці Мінскай вобласці*

*Назаві славутасці Віцебскай вобласці*

*Назаві славутасці Брэсцкай вобласці*

*Назаві славутасці*
*Гродненскай вобласці*

*Назаві славутасці*
*Гомельскай вобласці*

*Назаві славутасці*
*Магілёўскай вобласці*

*Назаві славутасці*
*Мінска*

Дадатак 10

Перавядзі словы з рускай мовы на беларускую

мальчик
февраль
утюг
картофель
флаг

Перакладзі словы з рускай мовы на беларускую

девочка
декабрь
сахар
художник
зеркало

Перакладзі словы з рускай мовы на беларускую

игрушки
кровать
сентябрь
лук
будильник

Перакладзі словы з рускай мовы на беларускую

конфета
октябрь
ковёр
карандаш
деревня

Назаві словы з гукам [ў]

Назаві словы з гукам [дз]

Назаві словы з гукам [дж]

Назаві словы з гукам [ч]

*Назаві словы з гукам [г]*

*Прыдумай сказ са словам*
***<u>горад</u>***

*Прыдумай сказ са словам*
***<u>Радзіма</u>***

*Прыдумай сказ са словам*
***<u>Наваполацк</u>***